# СТРУКТУРА ЗАГАЛОЎКАЎ ЛІРЫКІ ЯКУБА КОЛАСА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ 1898–1917 ГГ.)

**А. Д. Дакукін**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны», Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік В. А. Ляшчынская, д-р філас. навук, прафесар

Важнай часткай тэксту з’яўляецца такая структурна-семантычная катэгорыя, як загаловак. Загаловак, з аднаго боку, з’яўляецца адным са спосабаў раскрыцця тэмы, зместу і аўтарскай задумы (семантычны бок) і адначасова звязваецца з астатнім мноствам катэгарыяльных тэкставых паказчыкаў, уплываючы тым самым на структуру тэксту (фармальны бок).

Загаловак паводле сваёй будовы складацца з рознай колькасці слоў, што ўступаюць у пэўныя сэнсавыя і сінтаксічныя сувязі, што выяўляе агульныя прыкметы гэтай часткі тэксту і індывідцуальна-аўтарскія. Адным з аспектаў нашага вывучэння загалоўкаў лірычных твораў класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа з’яўляецца вызначэнне тыпаў загалоўкаў паводле іх будовы, характэрных мастаку беларускага слова, пры гэтым крыніцай ілюстрацыйнага матэрыялу абраны першы перыяд лірычнай спадчыны Якуба Коласа – 1898–1917 гг.

Усе вызначаныя загалоўкі вершаў Якуба Коласа, а іх налічваецца 299 у адзначаным перыядзе творчасці, суадносяцца паводле сваёй структуры са 1) словам, 2) словазлучэннем і 3) словаспалучэннем.

1. Паводле часцінамоўнай прыналежнасці раннія загалоўкі-словы (усяго іх налічваецца 119) належаць у сваёй большасці да назоўнікаў (на іх долю прыпадае 115 загалоўкаў-слоў), напрыклад: *«Краска», «Мара», «Вярбіна»* і інш., і адзінкавыя да прыслоўяў, прычым пры дапамозе апошніх названы толькі 4 вершы: *«Напрадвесні», «Увосень»* (такая назва ўжываецца 2 разы), *«Вясною»*. Назоўнікавыя загалоўкі характарызуюцца тым, што 77 слоў прадстаўлены лексемамі ў форме адзіночнага ліку, напрыклад, *«Пытанне», «Згнанніку», «Пясняр», «Сосна»* і інш. Амаль у два разы менш (усяго 36 адзінак) назваў, прадстаўленых у форме множнага ліку, напрыклад, *«Беларусам», «Хмары», «Аисты»* і інш., да якіх прымыкаюць назвы-назоўнікі Pluralia tantum *(«Могілкі», «Жмурки»*).

Найбольш частотнае ўжыванне загалоўка-слова ў форме Н. склону *(«Месяц», «Невзгоды», «Вецер», «Стогі»* і інш.), радзей – у форме Д. склону (*«Згнанніку», «Беларусам»* і інш.).

2. Аналіз загалоўкаў-словаспалучэнняў (а іх выдзелена 57 загалоўкаў) дазваляе падзяліць іх на дзве групы ў залежнасці ад структуры словаспалучэння: 1) самастойная часціна мовы ў спалучэнні са службовай і 2) спалучэнне двух слоў як аднародных, звязаных злучнікам.

*Першая група* загалоўкаў – самастойная часціна мовы ў спалучэнні са службовай прадстаўлена ў сваю чаргу дзвюма разнавіднасцямі, ці мадэлямі: а) мадэль «прыназоўнік + назоўнік у форме адпаведнага склону», якая ў ранняй творчасці паэта прадстаўлена 48 загалоўкамі, з якіх самымі частотнымі выступаюць спалучэнні назоўнікаў з прыназоўнікамі *на, за, перад, у*, напрыклад: *«На ростанках», «За падаткі», «У астрозе», «На мяжы», «З турмы», «Перад восенню»* і інш.;

б) мадэль «адмоўная часціца + дзеяслоў у форме загаднага ладу», якая прадстаўлена толькі двума загалоўкамі: *«Не бядуй!»* і *«Не дамся»*.

*Другая група* загалоўкаў – гэта спалучэнне двух слоў як аднародных, звязаных злучнікам. Структура ўтварэння пры гэтым аднастайная – два назоўнікі спалучаюцца злучнікам *і*, напрыклад: *«Баба і куры», «Пан і рэчка», «Мужык і клёпкі», «Конь і сабака», «Огарок и Базыль», «Дуб і кветкі», «Пастух і авечкі»*. І такіх загалоўкаў налічваецца 7 . Заўважым, што некаторыя даследчыкі, у прыватнасці, М. Г. Булахаў, Л. І. Бурак, адносяць такія тыпы злучэння аднародных членаў да словазлучэнняў.

3. Сярод назваў лірычных твораў Коласа на працягу 1898–1917 гг. выяўлены 114 загалоўкаў-словазлучэнняў, калі адно слова галоўнае, а другое залежнае. Пры гэтым галоўны член загалоўка-словазлучэння выражаецца: *назоўнікам* (абсалютная большасць прааналізаваных назваў, сярод якіх, напрыклад, *«Палескія вобразы», «Тры жаданні», «Песні вясны»* і інш.); *прыслоўем* (зафіксаваны толькі тры такія загалоўкі: *«На полі вясною», «У астрозе вясною», «Як і калісь»*); *дзеясловам* (колькасць назваў таксама невялікая, прычым дзеясловы ўжываюцца выключна спрагальныя і часта ў форме загаднага ладу, як, напрыклад, «Кіньце смутак», «Асадзі назад!» і інш.). Ужыванне ў якасці галоўных слоў прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў і дзеепрыметнікаў ці дзеепрыслоўяў як формаў дзеяслова ў загалоўках твораў Якуба Коласа не было зафіксавана.

Згодна з марфалагічнымі і семантычнымі ўласцівасцямі слоў у слова-злучэннях на матэрыяле выдзеленых загалоўкаў-словазлучэнняў намі выдзелена ў дакастрычніцкай творчасці 70 адзінак з сувяззю-дапасаваннем, сярод якіх, напрыклад, *«Сцёпкаў сон», «Нязбытныя надзеі», «Горкая доля»* і інш. Да ліку дапасавальнай сувязі далучаем загалоўкі, якія складаюцца з назоўніка і назоўніка-прыдатка, злучаных дэфісам, якія ў ранняй лірыцы Коласа адзначаюцца спарадычна, напрыклад: *«Сябрам-выгнаннікам»* і *«Сябру-бедаку»*, дзе назіраецца дапасаванне ў форме ліку – множны ці адзіночны, а таксама склону – тут форма Д. склону.

У ранняй творчасці Якуба Коласа спосабам кіравання ўтворана 42 назвы, напрыклад: *«Думкі салдата», «Песня над калыскай», «Пад шум ветру»* і інш.

Адзначым, што прымыканне ў коласаўскіх загалоўках-словазлучэннях дарэвалюцыйнага часу сустракаецца ў адзінкавых вершах: *«Як і калісь», «Раніца вясною»*, а таксама, у залежнасці ад вызначэння галоўнага слова, загалоўкі *«На полі вясною»* і *«У астрозе вясною»*.

Калі весці гаворку пра загалоўкі-сказы, то варта адзначыць, што іх дыферэнцыяцыя даволі складаная з тае прычыны, што ўсе без выключэння загалоўкі ўяўляюць сабой сказы, нават калі складаюцца з аднаго слова ці ўтвараюць спалучэнне слоў альбо словазлучэнне (напрыклад, іх можна лічыць безасабовымі, вакатыўнымі, генітыўнымі, намінатыўнымі сказамі і інш.).

Прэдыкатыўныя ўтварэнні-назвы, якія адпавядаюць сказу з двума ці адным галоўным членам, знаходзім у пісьменніка не вельмі рэдка, напрыклад: «Асадзі назад!» [1, с. 72], «Панас гуляе» [1, с. 121] і інш.

Паводле інтанацыі і мэты паведамлення пэўныя загалоўкі, што суадносяцца са сказам, выступаюць як клічныя сказы, напрыклад: «Не бядуй!» [1, с. 49] і інш.; як пытальныя сказы: «Дзе вы?» [1, с. 171], «Што трэба?»; як пабуджальныя сказы, напрыклад: «Кіньце смутак» [1, с. 45], «У дарогу!» [1, с. 293] і інш.

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што загалоўкі Якуба Коласа ў найбольшай колькасці прадстаўлены асобным словам (119 адзінак, ці 40 %), менш у спадчыне пісьменніка загалоўкаў-словазлучэнняў (114 адзінак) і яшчэ менш займаюць загалоўкі-словаспалучэнні (57 адзінак).

Літаратура

1. Колас, Я. Збор твораў у чатырнаццаці тамах. Т. 1. Вершы 1898–1917 гг. / Я. Колас. – Мінск : Маст. літ-ра, 1972. – 550 с.